© Пачатковае навучанне: сям’я, дзіцячы сад, школа № 1/2025

***Касцюк С. М.**, настаўніца пачатковых класаў гімназіі № 1 г. Брэста імя Абаронцаў Брэсцкай крэпасці*

# Ад батлейкі да паланэза

## Чалавек і свет. IV клас

## Тэст «У краіне майстроў і творцаў»

**1. Як называлі Беларусь?**
А) Краінай майстроў.
Б) Краінай воінаў.
В) краінай манахаў.

**2. З чаго ткалі паясы для заможных людзей?**
А) З лёну і воўны.
Б) З шэрсці і воўны.
В) З шаўковых, залатых і сярэбраных нітак.

**3. Як называўся гліняны выраб для абліцоўкі і ўпрыгожвання печаў?**
А) Кафля.
Б) Жырандоль.
В) Цэгла.

**4. Чым ганарылася гаспадыня Нясвіжскага палаца?**
А) Прыгожым адзеннем.
Б) Вырабамі са шкла беларускіх майстроў.
В) Добрым ураджаем.

**5. Для каго ткалі паясы з шаўковых, залатых і сярэбраных нітак?**
А) Для бедных людзей.
Б) Для заможных людзей.
В) Для ўсіх людзей.

**6. Які беларускі паэт прысвяціў адзін са сваіх вершаў слуцкім майстрам?**
А) Якуб Колас.
Б) Янка Купала.
В) Максім Багдановіч.

**7. Што адлюстроўвалі на кафлі ў 17 стагоддзі беларускія майстры?**
А) Выявы людзей і жывёл, радавыя гербы.
Б) Геаметрычныя фігуры.
В) Кветкі і дрэвы.

**8. Што такое палац?**
А) Высокае абарончае збудаванне з дрэва ці цэглы.
Б) Галоўная царква ў горадзе.
В) Вялікі і шыкоўны будынак.

**9. Каля якога горада з'явілася першая беларуская майстэрня па вырабе паясоў?**
А) Каля Слуцка.
Б) Каля Нясвіжа.
В) Каля Гродна.

**10. Чым адрозніваліся слуцкія паясы ад іншаземных?**
А) Ніткамі.
Б) Шырынёй.
В) Узорамі.

| |
|---|
| <u>Заданне для групы 1.</u><br>Знайдзіце адказы на наступныя пытанні:<br>1. Што такое батлейка?<br>2. Які выгляд мела батлейка?<br>3. Калі ўзнік лялечны тэатр?<br>4. Калі паказвалі часцей за ўсё батлейку?<br>5. Якія героі былі ў тэатры?<br>6. З чаго вырабляліся лялькі?<br>7. На якія тэмы былі выступленні артыстаў?<br>8. Якіх герояў высмейвалі, а да каго ставіліся з пашанай?<br>9. Дзе выступалі батлеечнікі? |
| <u>Заданне для групы 2.</u><br>Складзіце аповед пра дзейнасць Сімяона Полацкага па пытаннях:<br>1. Дзе і калі нарадзіўся Сімяон Полацкі?<br>2. Што ён стварыў у Полацку?<br>3. Калі атрымаў імя Сімяон?<br>4. Кім Сімяон Полацкі быў у Маскве?<br>5. Што заснаваў ён у Маскве?<br>6. Які быў буквар Сімяона Полацкага? |
| <u>Заданне для групы 3.</u><br>Падрыхтуйце апавяданне пра развіццё тэатра і паланэз К. Агінскага па пытаннях:<br>1. У якім стагоддзі пачалося развіццё прафесійнага тэатра?<br>2. У якіх замках існавалі знакамітыя тэатры?<br>3. Кім былі артысты ў гэтых тэатрах?<br>4. Чым славіўся тэатр Міхаіла Казіміра Агінскага?<br>5. Як называўся паланэз Міхаіла Клеафаса Агінскага? |

© Пачатковае навучанне: сям’я, дзіцячы сад, школа № 1/2025